# РЭМЕНЬ АД ЭТУДНІКА

## Чаму энцыкляпэдыі маўчаць пра Рамана Семашкевіча ды Давыда Якерсона

Пра жыцьцё й сьмерць Ван Гога вядома, бадай, усё. Пішучы ж пра беларускае мастацтва, я сутыкнуўся зь дзіўнай акалічнасьцю, якая карэктуе ўсё, што я пісаў. Чым бліжэй да мяне ў часе творчасьць і лёс мастака ці архітэктара, тым складаней... Беларускія біяграфіі XX стагодзьдзя заблытаныя і захутаныя смугою недагаворак, намёкаў, інтэрпрэтацыяў. Калі ў папярэднія эпохі мастакі разглядалі эпісталярны й мэмуарны жанры як спосаб падзяліцца сваімі ідэямі, прыадчыніць вакенца ў сваё сьветаадчуваньне, а то і рашуча сьцьвердзіць свае эстэтычныя прынцыпы, дык у XX стагодзьдзі адбывалася ўсё наадварот. Мастакі імкнуліся ў суплёце палітычных рэаліяў як мага глыбей зашыфраваць свой сьветапогляд. А то й папросту схаваць акалічнасьці сваіх біяграфіяў.... Тут мне прыгадваецца анэкдатычная гісторыя... Аднаго разу сустрэў паэт і мастак Адам Глёбус на вуліцы славутага скульптара Заіра Азгура і кажа: «Вось, маўляў, Заір Ісакавіч, вы выдалі выдатную кнігу «Што помніцца...». Але вы там нічога не напісалі пра тое, як стваралі сталіных, мао дзэ-дунаў, кім ір сэнаў...» «Малады чалавек, – адказаў Азгур, – як завецца мая кніга? Так, «Што помніцца», а гэта ўсё ня помніцца...»

На пачатку 1930-х гадоў Азгур быў першым скульптарам, які ўвасобіў вобразы Коласа й Купалы (для фасаду Нацыянальнага тэатру), а таксама іншых дзеячаў беларушчыны – Францішка Багушэвіча, Кастуся Каліноўскага, Уладзіслава Галубка, Усеўлада Ігнатоўскага ды багата каго яшчэ... У мастакоўскім асяродку хадзіла легенда, што нібыта аднаго вечару Азгур мусіў замкнуцца ў майстэрні й пазьнішчаць усе свае творы, у якіх

сачылася якая «нацдэмаўшчына»… Пасьля ўтварэньня дзяржавы Ізраіль ён быў прасякнуўся сіянізмам, стварыў багата вобразаў дзеячаў жыдоўскае культуры. Сярод іх была скульптура Міхоэлса, зь дзіцёнкам на руках. Вось гэтае дзіцё й мела ўвасобіць сабою маладую Ізраільскую дзяржаву… Але пасьля трагічнае сьмерці Міхоэлса ў Менску напужаны Азгур ізноў замкнуўся ў майстэрні… і зноў разьбіваў дашчэнту свае работы.

За бясконцымі самакансьпірацыямі й самаабмежаваньнямі пазьнікалі цэлыя плоймы імёнаў. Лішне казаць, што ані дзяржава, ані тое, што завецца «творчай інтэлігенцыяй», не выяўлялі й не выяўляюць цікавасьці да іх узнаўленьня. А праз тое вялікія абсягі нашае культуры застаюцца ў смузе… Таму я дазволю сабе нагадаць пра дзьве асобы, што, без усялякага сумневу, мусілі б заняць у гісторыі нашае культуры пачэснае месца…

Марна шукаць у беларускіх энцыкляпэдыях імя Рамана Семашкевіча. Яго там няма. Было колькі публікацыяў у пэрыёдыках, у прыватнасьці, у «ЛіМе» ды «Культуры», але было тое даўна. Мо таму стогадовы юбілей гэтага выбітнага мастака прамінуў у Беларусі незаўважна. Семашкевіч папросту выпаў з кантэксту нашае культуры. А між тым, ягоны юбілей адзначылі ў Расеі: выдадзеныя альбомы, зьняты дакумэнтальны фільм, прайшло некалькі шумных выставаў. Яго там называюць не іначай як «мараю калекцыянэраў».

Нарадзіўся ён у кастрычніку 1900 году ў мястэчку Лебедзева, што на Маладзечаншчыне. Гадаванец Віленскай беларускай гімназіі, вучань Язэпа Драздовіча, Семашкевіч у 1925 годзе прыбыў у Менск, адкуль разам зь іншым навучэнцам Міхасём Філіповічам перабраўся ў Маскву, на вучобу ў Вышэйшых мастацка-тэхнічных майстэрнях. У Семашкевіча зь Філіповічам нават імёны бацькоў супадаюць. Абодва – Мацьвеевічы. Празь пяць гадоў Філіповіч усё ж вяртаецца ў Беларусь.

Семашкевіч нічога ня ведаў пра лёс свайго сябра. Ягоны ж уласны лёс склаўся на чужыне зусім ня добра. Напачатку 1930-х ён паехаў быў у Тбілісі, да яшчэ аднаго земляка, беларуса Кіры-

лы Зданевіча, таго самага, што адкрыў нам сьвет Пірасманішвілі. Пабачаная на кватэры Зданевіча калекцыя твораў геніяльнага грузінскага прымітывіста зрабіла на Семашкевіча калясальнае ўражаньне. З таго часу традыцыяналісцкі было жывапіс мастака рэзка зьмяняецца. Ён становіцца насычаным, зьдзічэлым, натуральным. Можна, праўда, шукаць ня столькі грузінскіх, як францускіх каранёў ягонага мастацтва. Лёгка паставіць яго ў адзін шэраг з Утрыла, Марке, Дзюфі ці Руо. Што праўда, семашкевіцкая графіка тым часам застаецца выкшталцонай і пекнай, толькі зрэдзьчасу пераўвасабляючыся ў экспрэсіяністцкія выверты. У 1931-м ён уваходзіць у мастакоўскую суполку «Трынаццаці», разам зь сябрамі якой ладзіць вялікую выставу ў Маскве. Сярод іх было колькі беларусаў, што знайшлі сабе прытулак пад непахіснымі сьценамі Крамля: Стэфанскі, Мілашэўскі, Дрэвін, Рамановіч. Нішто сабе была суполка – ці не апошні ўсплёск мастакоўскае свавольнасьці. Урэшце, толькі яна і лучыла іх – людзей featuresрознага маштабу й розных эстэтычных прыхільнасьцяў.

Тымчасам як у Менску рэпрэсіі ўжо набывалі статыстычны размах, у Маскве на тое не выглядала. За лякерам усьмешлівага аптымізму яшчэ не было відаць вупыровых іклаў. А Семашкевіч нібы ўжо нешта вычуваў. Вось, напрыклад, малюнак «Чалавек і пачвара». Стаіць сабе мужык як мае быць, у ботах ды картузе, а за ім ужо цікуе нейкая земнаводная страшыдла з высалапеным языком. Альбо – рыхтык гагенаўскія «Арыштанты» – «Зводзяць зьняволенага», «Шпацыр вязьняў». Прадчуваў? Можа быць. Як і шмат хто іншы. Але ў адрозьненьне ад іншых, ён выкладаў свае прадчуваньні на роўнядзь паперы. Зрэшты, асабліва гадаць не даводзілася. Два ягоныя родныя браты былі арыштаваныя за пераход мяжы і польскі шпіянаж. Па іх не засталося ані знаку.

1 лістапада 1937 году прыйшлі й па яго. У пратаколе «тройкі» значылася: «за нелегальны пераход савецкае мяжы (прыгадалі!), за актыўную контрарэвалюцыйную фашыстоўскую дзейнасьць,

усхваленьне фашыстоўскага ладу, два браты-шпіёны...» Ні на адным допыце Семашкевіч вінаватым сябе не прызнаў. Нікога выдаваць не зьбіраўся. 17 лістапада допыты перапыніліся. 22 сьнежня яго расстралялі. Каб расстраляць, завезьлі чамусьці ў Татарстан. Ягоных жа сяброў чакалі толькі высылкі. Мо дзякуючы ягонаму маўчаньню яны засталіся жывыя?

KAMUNIKAT.org